# Алесь Камоцкі

# неўпрыкмет

***

Блукаем адвеку між пеклам і раем,
Шукаем, губляючы час,
Праз тыя дарогі, што мы выбіраем,
Дарогу, што выбрала нас.

Зацята не верым яе паваротам,
Павольна губляючы рытм,
Стамляецца лёс без належнай ахвоты
Нам нашы памылкі дарыць.

Здзіўлення не помнім, у казку не верым,
Мінулае раздаючы,
Здаўна пакідаем сляды на паперы,
Якая цярпліва маўчыць.

Сучаснасці прагне амбітная доля,
Скідае аркуш пад нагу,
І далей без згоды яе і дазволу
Я кроку зрабіць не магу.

Чаму і на колькі, куды і навошта?
Ці трэба камусьці адказ,
Калі разуменне прыходзіць, што проста —
Дарога не бачыла нас.

+++

Давай будзем думаць пра гэтае заўтра,
Давай будзем сёння не помніць пачатак.
Хай п’еса ідзе, хай здзіўляецца аўтар,
Хай сутнасць павольна змяняецца ў часе.

***

Час ішоў, магчымасці знікалі,
Небу сны вярталі вечары.
Сумавалі байкі без маралі
І фінал прасілі паўтарыць.

Так было, што свет здаваўся вечным,
А спакой развагі не губляў,
І вялі чаканні да сустрэчаў,
Сэнс надзейна бачыўся здаля.

Так было, што дзень, як ёсць апошні,
Сваё месца проста не шукаў.
І здзіўленне — колішні памочнік —
Пазбаўляла сілы ў руках.

Але ўсё часова, дзякуй Богу,
І мінае ўсё, як ні круці:
Ты калі выходзіў на дарогу,
То дакуль па ёй хацеў ісці?

* * *

Учора, калі быў я малады,
Па-іншаму рабіліся намёкі,
І ўсе, хто за тым часам быў навокал,
Патроху не зважалі на гады.

Ні рытм, ні тэмп не ведалі бяды,
Хапала фарбаў выдумцы і думцы.
Складаўся свет з дазволаў і прэзумпцый,
Ды не таго хацелася тады.

Але ж…
Заўсёды нам было куды ісці,
І час лічыць не мелася матыву.
За ўсё, што галава рабіла крыва,
Здзіўленнем удавалася плаціць.

Прыходзіў сэнс нясмела і часова,
Але нядоўгім быў ягоны век —
Галоўны вораг сэнсу, чалавек,
Штораз цынічна перабблытваў словы.

Цяпер не так — цяпер усё мудрэй:
Сівыя камяні жаданні імітуюць.
Згубі сваю душу — дадуць табе другую,
Бяры, насі і сам яе чым хочаш грэй.

Разумных межаў более наўкол,
Але яны не хочуць нашай праўды,
Бо іхны сэнс — паўсюль змыкацца плаўна
І нараджаць патрэбу на дазвол.

Пытанне — што далей? — хаваецца ў мінуласць.
Цікавіць бальшыню — які чакаць канец?
І тая бальшыня нахабна спадзяецца —
Калі кульнецца свет, то іх не перакуліць.

Але ж настаўнік-час такі дае урок —
Забудзьцеся, што вам расказвалі ў школе.
Аджыў сваё закон — жыццё ідзе па коле,
Яно не першы крок ідзе ужо набок.

* * *

Пачатак у шматлікага адзін,
Непадуладны мерам і намерам.
Мы на яго звычайна не глядзім
Ды робім выгляд, што паціху верым.

Ці ж можа розум сутнасць асягнуць,
Застаючыся голым і практычным?

Ці можа восень пачынаць вясну?

Ці можа цень смяяцца навучыцца?

* * *

Жыццё — гэта сёння.
Пра заўтра і ўчора
Мы марым, ці помнім усякіх гісторый.
Жыццё — гэта сёння.
Шлях памяці ў мары
Знаходзіць прычыну
Былому, якое маўчыць за плячыма.
Жыццё — гэта сёння.
А будучы дзень
Перад тым, як настане,
Бязгучна шукае сваё апраўданне.
Жыццё — гэта сёння.
Не дзівіць наяўнасць
Бягучай хвіліны,
Што ўжо непапраўна сябе адхіліла.
Жыццё — гэта сёння.
Няўцямнаму заўтру
Ствараю прастору,
Як ветлівы аўтар нягегламу твору.

*

Не кожнаму вуху
Паслухаць няймецца
Пра тое, што выйдзе
На гэтае месца.

**Хваробе**

Слыхам, уздыхам, голасам
Кранаю начы валасы.
Ды бачу, як небам колішнім
Напэўна лятуць галасы.

Абуджаны ранішняй смагаю,
Хачу развітацца з тугой…
І, твар папсаваўшы адвагаю…
Жыццё падзяляю з табой!

* * *

Мне хочацца зразумелага,
Нязмушанага і рэальнага,
І каб не глядзець напружана
На большасць інтэлектуальную.

Ні сутнае, ні прычыннае
Ніколі не мерыць коштамі.
Мне хочацца немагчымага
Ад інтэлектуальнай большасці.

* * *

Штораніцы становімся дурней,
Штодня хаваем сэнс за выраз твару.
Адносіны паробіўшы таварам,
І хочам, і не можам як даўней.

Брыдзём зігзагам, колам, паваротам,
Наўпростых рухаў ведаем няшмат.
Згубіўшы прыхаванае на потым,
Шукаем нерэальны шлях назад.

Чарговы дзень губляе свой пачатак,
Пакуль канца не ведае на смак,
І кожны пень сабе чакае свята,
Яно ізноў прыходзіць абы-як.

Неразбярыхі быццам бы багата,
Ці ж зразумее ў выніку народ —
Даўней было, што брат ішоў на брата,
Цяпер, нарэшце, ўсё наадварот.

* * *

Губляюць спадзяванні актуальнасць,
Здзіўлення пазбягаючы пры гэтым.
І нейкай бессэнсоўнай робяць мэту,
І робяць разуменне нерэальным.

Губляе спадзяванні актуальнасць,
Здзіўленне паглыбляючы пры гэтым.
І нейкай недасяжнай робіць мэту,
І робіць спасціжэнне ненармальным.

Гублянне спадзяванняў актуальных
Здзіўляе, пазбягаючы пры гэтым
Нязвыклай бессэнсоўнасці сусвету,
Адвечнай паўсядзённасцю задаўленай.

* * *

Мы у досвітках першых спатканняў
Будзем марамі снедаць у снах
І салодкім матывам чакання
Распачнём песню новага дня.

І узнімемся ў неба высока,
Свае сэрцы ад зор запаліць.
Спраўна спляжым аб глебу самоту,
Каб адчуць, як душа не баліць.

Каб знайсці ахінуты туманам,
Поўны жарсці асенні букет,
Каб часова паверыць падманам,
А пасля зразумець гэты свет.

* * *

Мой час спяшаецца насустрач,
Здзівіўшы ход тваіх хвілін,
З незразумеласцю пачуццяў
Памкненні нашыя дзяліць.

Каб непазбежнае тлумачыць,
Не варта думкі марнаваць,
Бо спадзяецца на удачу
Мая сівая галава.

Не надта ўтульная эпоха —
Прасторы волі не стае.
Калі не мае чым палохаць,
Хаця б спакою не дае.

* * *

Насустрач пралятаючым гадам
Душа свае рэзоны выкладае.
Жаданні разбіваючы аб далеч,
Ёй шлях свае памкненні не аддаў.

Рашучых крокаў ён не разумеў,
Чакаў цярпліва адпаведны момант,
Бо так хацеў радзей выводзіць з дому…
А у душы інакшы быў намер…

Зламаны лад звычайнага жыцця
Імклівы дзень за раніцу трымае,
І хоць душа на ўсё рэзоны мае,
Але не ёй здзіўляецца працяг.

* * *

Проста дзень не пачаўся,
Пакрыўдзіўшы ранак,
Каляндар паламаўшы.

Выглядае заганна
Непазбежнасць працягу
На шляху сапсаваным.

Тут мінуламу варта,
Прыхаваўшы усмешку,
Выдаць вынікі жартаў.

І ўсё будзе заўтра.

## Вайцюшкоўскія рэфлексіі

За размовамі ў вечар летні
Ноч свае прыхавала сны,
А бяседа ішла без мэты
Ад штодзённае мітусні.

Перакрочыўшы хвалю часу,
Зразумеўшы усё прасцей,
З успамінаў сваіх уласных
Кожны выбраў, што захацеў.

І шукаў сабе месца сподзеў,
І заблытваў свой шлях працяг,
Сум спыняўся на падыходзе,
Адбіваючыся ў вачах.

* * *
Ідзе жыццё не па парадку
Сярод паблытаных шляхоў.
Мы час губляем на здагадкі
І памыляемся ізноў.

Не даўшы рады патлумачыць,
Хто ад каго чаго хацеў,
Упарта не жадаем бачыць,
Як насамрэч усё прасцей.

Пара адвыкнуць не спыняцца,
Пара здзіўляцца простым рэчам,
Пара да цудаў спрычыняцца
У існаванні чалавечым.

***
Шляхі змянялі марам адрасы,
Адлегласці нязмушана глытаючы,
Стараліся няўдалыя часы
Тлумачыць кепскай памяццю і далеччу.

Шляхі вялі дарогамі зямлі,
Хавалі далягляды у штодзённае.
Даўней мы іх любілі як маглі,
Далей, і сапраўды, не надта помнілі.

***
Ці ўспомняць іншыя часы
Пра крокі нашыя пасля?
Слядоў астылых галасы
Ці далятуць да іх здаля?

***
Нам залішыцца толькі будучыня
З паназдабытага ў мінулым.
Бягуць часы, шляхі руйнуючы,
І не істотна ўжо, адкуль яны.

***
Ня надта мы ўжо думаем пра вечнае,
Аддаўшы перавагу выпадковаму,
Пакуль здзіўляюць сэнсам дні сустрэчныя,
Пакуль ірвуць спакой прычыны новыя.

Замест таго, каб кожны вечар каяцца,
Да сноў кароткі шлях шукаем вечарам,
Бо заўтра ж трэба радавацца раніцы.
І пачынаць таксама трэба з нечага.

***
То пяском, то снегам церусіць у вочы.
То зіма, то лета блытаюць шляхі.
Там пустой дарогай ты ісці не хочаш,
Тут шукаеш сцежак вузкіх і глухіх.

Там калісьці ведаў тых, хто разумее,
І, праз пэўны сподзеў, ведаў, што рабіць.
Ведаў, што патрапіш, ведаў, што паспееш.
Тут абы не помніць, тут забыць абы.

Рух спыняць не варта без жывой прычыны,
Каб шукаць кірунак і агорваць час,
Дзверы знойдзеш потым, потым іх адчыніш,
Рух спыняць не варта, ён адзіны ў нас.

Рух калісьці ведаў тых, хто разумнее,
І, праз пэўны сподзеў, ведаў, што шукаць.
Ведаў, што патрапіць, ведаў, што паспее,
Каб застацца сілай у сляпых руках.

***

**1**

Марна зоркі міргаюць,
бо вочы не бачаць нічога.
Можна думаць спакойна,
пакуль не пачнецца рассвет.
Ён напэўна пакажа
пытанні, што дорыць учора,
Бо яно не мінае,
а проста ўздыхае услед.

**2**

Пракладаем дарогу
да новага ранння скрозь вечар,
Абіраем напрамак
паглядам звычайных вачэй.
Набягаючы час
нас сустрэне і крыху палечыць,
І наросціць нам крылы
з апушчаных долу плячэй.

***

Жыццё мы бачым, як умеем,
і, сэнс шукаючы, бывае,
так дзіўна часам выглядаем,
калі пры згубленай надзеі
перакідаем апраўданні
па-за рэальныя падзеі.
А быць імкнёмся там, дзе дзеляць.
Быць там, дзе множаць, не жадаем.

***

Нарэшце ўжо няма пра што казаць,
хаця часы падзеі нараджаюць,
і наваколле нечага чакае,
і шлях любы кірунак дазваляе,
апроч таго, які вядзе назад.

За паслядоўным рухам цішыня
у скрыжаванні нежаданых сэнсаў.
Там даўны тлум на кроплю не паменшаў.
Яго пара на новы замяняць.

Ён зможа на пытанні адказаць.
Але і ён не можа, каб назад.

***

Услед за восенню, няведама куды,
Не разважаючы, трапляючы у плынь,
Не ведаць памяці, не заўважаць сляды,
Калі дзяліць ці памнажаць, то на адзін.

Нязграбнай раніцы пазбавіцца хутчэй,
Не дачакаўшыся пакуль узнікне час,
Кавалкі позіркаў у глыбіні вачэй
Усім пытанням памыляюцца ў адказ.

Па-за самотай, калі выйсце знойдзе шлях,
Пачнецца дзень, які забудзецца на ноч,
Які пакіне справы лішнія у снах,
Які ніякіх тлумачэнняў не захоча.

***

Бясконцасць замяніць
на
рух па коле,
і клопату адразу неяк меней,
ды звыклай праўды новыя адценні
упэўнена фарбуюць хібы сценак,
ажно да столі.

А дом прыцiх,
пакуль,
здзіўлення поўны,
Кіруе вечар стомленыя вокны
У лістапад застуджаны і мокры,
Найноўшым снам працівіцца штомоцы,
але бязмоўна.

На кола дзён
націсне
кола лёсу
Шляхі ў жаданы бок ураз адрэжа.
Бясконцасць забярэ з сабой бязмежжа,
У новы клопат незнарок улезе,
і будзе досыць.

***

Вятры ў абдоймы цішыні не залятаюць,
Мы разам бачым сон, якім здзіўляе ноч,
З нязвыклай цемнаты, бязлітасна чужая,
Што блытала сляды і не дайшла сюды.

Што клікнула здалёк, здзівіла і прапала,
Набіўшы брыдкіх плям у мройным забыцці,
І дрэнна, што ужо вядомай стала далеч,
І добра, што пакуль магчыма не ісці.

***

Адной рукой кіруючы няспынна,
Другою правяраючы кішэні,
Рабіла з мяне гопніка краіна,
Душа ж хацела іншага рашэння.

Свядомасці куды было падзецца?
Налева крок, направа крок – і багна.
Мудрэй за ўсё – не йсці, а адсядзецца,
Адно – душа ўгару сарвацца прагне.

Забыць што варта быць самім сабою,
Утульна, як паспаць пасля абеду.
Ёсць праца ад запою да запою,
І ёсць магчымасць Турцыю наведаць.

Чаму не жыць пры гэтакім раскладзе,
Не горш за іншых, без праблем істотных,
І напляваць на сум у лістападзе,
І разлюбіць гаючую самоту.

Аддаць краіне ўсе даўгі нарэшце,
Якія яна нам напрызначала,
І апынуцца у тым самым месцы,
Якога у аб'ёме вельмі мала.

Ні ўдоўж, ні ўшыркі, ні назад, ні ўперад.
Сядзець  і для турбот не мець прычыны.
Каб шчасце я спазнаў такою мерай,
Рабіла з мяне гопніка краіна.

***

Усё галоўнае прыходзіць нечакана,
Пасля, бывае, і не ўгледзіш, як міне,
І асабліва гэта тычыцца кахання,
Хоць кожны думае — ці ж гэта пра мяне!

І сівізна, і ладны вопыт за плячыма,
Здзівіць нялёгка, і збянтэжыць не прасцей.
Ды не сказаць, каб гэта надта навучыла
Прымаць жаданае і правільна хацець.

Пытанні мкнуцца узнікаць, ды ім няёмка,
А да таго ж, нібыта час не настае,
І мы з вантробамі надзеям аддаёмся,
Пры тым чужыя разглядаем як свае.

Няма пытанняў — дык адкуль узяць адказы,
Калі размовы няўзніклыя маўчаць...
Магчыма, заўтра, але хочацца адразу.
Тут сама тое – з нечаканага пачаць.

+++

Усё галоўнае прыходзіць нечакана,
Пасля, бывае, не заўважыш, як міне,
Я рыхтаваўся да апошняга кахання
І перачытваў напісанае раней.

***

Калі б не пачыналася зіма,
Я б не знайшоў сябе ў вашым доме.
Усё было б, напэўна, па-другому,
Калі б не пачыналася зіма.

І драбязу асенняга цяпла
Я размяніць хацеў усю дашчэнту,
Але зіма, пахерыўшы акцэнты,
Прапанаваць нічога не змагла.

Тады жыццё пайшло на новы лад,
Другія сэнсы сталі пераважваць.
Прычыне лёс застацца недасяжнай,
Зіма ж нагодай толькі і была.

***

Псуюць жыццё бясконцыя прыкметы,
Тлумачачы, чаму так не шанцуе,
А рэшткі мар, што полем гоніць вецер,
Іх тлумачэнні ўвогуле не чуюць.

Няма вясны, вясна была ўчора,
Яна яшчэ хацела бачыць змены.
Ляціць жыццё зусім не бездакорна
Халоднай, шэрай раніцай асенняй.

Прыкметы ж, забываючы збывацца,
Заводзяць сэнс у новае балота
І нават ветру не даюць памацаць,
Якое дзіва нас чакае потым.

Хутчэй за ўсё, не так плануе аўтар,
Хутчэй за ўсё, мы самі нішчым цуды.
Няма зімы, зіму чакаем заўтра,
І невядома, як з ёй ладзіць будзем.

***

Пра дзень, які так хочацца забыць,
Ці варта думаць, сніць, спяваць і помніць?
Якая розніца — ён белы быў ці чорны,
Той дзень, які так хочацца забыць.

Быў дзень, якога памятаць не след,
Былі там людцы, што не мелі сілы,
Былі і тыя, што яго рабілі.
Я бачыў тых, каго яны любілі
У дзень, якога памятаць не след.

Той дзень, які не варта ўспамінаць,
Забраў сабе і сподзевы, і мары,
І лоўка так зрабіў куты з абшараў
Той дзень, які не варта ўспамінаць.

Быў дзень, які не трэба паўтараць,
Была вайна заместа адэквата,
Не кожны верыў у яе пачатак.
Я ж помню як згарэла мая хата
У дзень, які не трэба паўтараць.

***
Празрыстыя людзі паўсюдна шчыруюць,
Сляды пакідаюць наўкол.
Іх вочы убачаць, іх вушы пачуюць.
Іх рукі абернуць на дол.

Празрыстыя людзі празрыстыя словы
Празрыста выказваюць спрэс.
Бянтэжыць разумных, але беспантовых
Нягеглы вербальны працэс.

Схаваўшы ад іншых сваё,
Празрыстыя людзі чужому не вераць,
Празрыстыя людзі пладзяцца без меры.

***
Ад імгненняў да вечнасці карацеюць шляхі,
На аскепках адметнасці не губляецца сутнасць,
І далёка не сэнс робіць веру магутнай.
Ён адно што тлумачыць былыя грахі.

Развітайся з жаданнямі запаволіць хаду,
Не разлічвай на даўняе і прывычнае глупства.
Хай цябе не хвалююць ні плён, ні наступствы,
Думай болей пра шлях, пакуль ногі ідуць.

***
Межам стылю акрэсліцца стала значна цяжэй,
Канчаткова заблытаўся выбар новых дарог.
Хто б у гэтых рэаліях зразумець дапамог
Прынцыповую розніцу паміж мачо і чмо.

Я надзвычай збянтэжаны тым, што бачу вакол.
І даўней так здаралася, а цяпер пагатоў:
За абцасы чапляецца па дарозе дамоў
Невялікая розніца паміж мача і чмо.

* * *
Куды вядзе мая дарога адусюль,
Дзе я бываю выпадковым чынам
І не умею ведаць пра прычыны
Нягеглых святаў выпітай душы,
Якая не збіралася грашыць?

Дваццаць трэцяга ліпеня
Можа рознае быць ці не быць.
Дваццаць трэцяе ліпеня —
Дзень, не горшы за іншыя дні,
Каб мінулае выкінуць,
Нешта выдумаць ці адмяніць.
Можа рознае быць і не быць
Дваццаць трэцяга ліпеня.

Калі дарогу бачыць не хачу,
Спыняюся за першым паваротам
І пачынаю марыць неахвотна
Аб новых кроках выпітай душы,
Якая не збіралася грашыць.

* * *

Шукай, знаходзь і не губляй,
І не лічы пачаткі дзён,
Але пра час
Не забывай.
Не забывай –
Яму належыць першы крок,
Ён дорыць вынікі шляхам.
Прыходзіць час,
Каб бачыць нас і не знікаць.

Бывае, небу не да нас,
Бывае, сонца не відно.
Чарговы раз
Прыходзіць час,
Праходзіць час.
І мараць новыя шляхі
Пра крокі нашыя, але
Не бачыць свет
Наступны след.

Часы.
Не мы іх абіраем для сябе –
Іх воляй узнікаюць нашы дні,
Іх воляй пралятаюць нашы дні.

* * *

Усё цяжэй паразумецца з векам,
Шукаць,
              пусціўшы стому у імпэт,
Тых,
       для каго застаўся чалавекам.
... і пра самоту марыць неўпрыкмет.

Трымаць недаацэненую шчырасць
Напагатове кожны божы дзень,
Спасцігшы вынік, забываць прычыну
І лішні раз уперад не глядзець,
Дзе тое, што з гадамі прыгажэе,
Прызнання дамагацца не ідзе,
Дзе сутнасць, перастаўшы быць ідэяй,
На век,
       што знойдзе,
             тое й пакладзе.

* * *

Не ўсё здараецца захоўваць —
Губляем часткі пакрысе.
Набраўшы моцы, бессэнсоўнасць
Здзіўляе верaю у сэнс.

* * *

У снежаньскую сцюжу пачынаўся раман,
Адно што завіруха нешта бачыць магла –
Гэта зіма.
З ёй зімаваць –
Не дадаць і не адняць.

Гісторыя кахання не давала заснуць,
У мроях недасяжна панаваў сакавік –
Гэта зіма.
Гэту зіму
Ні прыспешыць, ні спыніць.

Бязгучна падышла і не змагла расказаць,
Чым цябе здзівіла напрадвесні яна –
Гэта зіма.
Гэту зіму
Зімаваць і забываць.

* * *

Гарць паціху свечы,
Рыфмуе думкі вечар.
Не хочацца пытанняў —
На ўсе адзін адказ.
Мы разганяем хмары,
Мы дасягаем мары,
Але, на жаль, не ў стане
Стрымаць бягучы час.

Імгненні як імгненні,
Памкненні як памкненні,
Мужчыны і жанчыны,
Умоўнасці наўкол.
Алоўкам па паперцы
Малюе межы сэрца.
Карцінка як карцінка...
Звалілася пад стол.

## Вечар

Хараство знікаючага неба
Сёння зноў наіўна нішчыў вецер.
Наляцеў аднекуль непрыкметна
І шпурляў, шпурляў у неба смецце.

Ці паўночны быў ён, ці паўднёвы…
Ці даўнейшы быў, ці нейкі новы…

Толькі ноч бязроднага суцішыць,
Узваліўшы сны яму на плечы.
І у зніклым небе стане чыста,
І з сусвету зоркамі засвеціць.

## Музыка

Вечар, накрыўшы горад
Ціхім і цёмным небам,
Кліча у вышыню.
Стомленым рэшткам сонца
Перастае належаць
Дзень, што ужо мінуў.

За
Сонечным святлом
Кропелькі цяпла —
Як нотныя радкі.
І
Промнем па струне
Бліскавічны шлях
Бязважкае рукі.
Плыў
Месяцам сівым,
Каб, як апошні раз,
У гэты дзень глядзець.
Сон
Натоліць нас пасля
Пярэстай хваляй мар,
Чаканняў і надзей.

Хутка раскажа вечар,
Дзе ў вірах мелодый
Новы матыў кране.
Музыцы там спакойна,
Музыка там начуе,
Там яна сніцца мне.

* * *

Ходзіцца па зямлі,
Думаецца пры тым –
Як бы усе жылі,
Збіўшы сабе панты?

* * *

Адвечны шлях, якім жыццё праходзіць,
Яднае тых, хто марыць пра святло.
Але, на жаль, далёка не заўсёды
Стаўляе гэту мару на крыло.

* * *

Жыццё – імклівы рух сярод спакусаў,
Тут цяжка быць падалей ад граху.
Дык дай жа, Божа, сілы беларусу
Трымацца годна на усім шляху.

* * *

Дзе сляды ад снягоў, што ў мінулым жыцці
Пакідаюць зямлю сакавіцкім дзяньком?
Ім ужо не ляцець, ім ужо не ісці –
Безназоўным і брудным плысці раўчуком.

* * *

Прыйдзе час, і застануся я у снах,
Там, дзе хвіліны на імгненні час не дзеліць,
Там, дзе палёту без патрэбы будзе цела,
Там, дзе бясконцасцю нацешыцца вясна.

* * *

Я, як заўжды, маўчу,
Словы вакол стаяць.
Ты, як заўжды, не тут,
І без цябе ніяк.

**Сны**

Вечар
Сумам пустых завулкаў,
Сполахам крокаў гулкіх
Рушыў у межы сноў.
Сподзеў
Пераглядаў надзеі,
Мары услед ляцелі,
Час у зіму ішоў.

На асфальце мокры снег
Разам з шэрым небам
Невыразны цень
Крадзе
На шляхах
Па слядах былых
Блуканняў.
Так і ноч настане.
Можна сны глядзець,
Можна сны глядзець.

* * *

**1**

Хмарам неба не належыць,
Неба хмарам толькі так –
У далёкае бязмежжа
Шлях.

Хмары – шэрая навала,
Набягаюць зніадкуль.
Ім бывае месца мала
Пакуль.

Неба – сіняе бязмежжа,
Хмары – плямы па краях.
Хмарам неба не належыць
Аніяк.

Ім — жыццё, а нам — імгненне,
Хмары маюць іншы час.
Пралятаюць іх памкненні
Не праз нас.

**2**

Сонца бачыць зверху неба,
Позірк шле за небакрай.
Дзе дзяецца ён пасля —
Шукай.

Хмары неба бачаць знізу,
Цень кідаючы зямлі.
Хай бы ўсе яны ад нас
Плылі.

Зоры неба зверху бачаць,
Так загадкава мігцяць.
Ім адвеку ёсць задача —
Не згараць.

Зоры, неба, хмары, сонца
Карагодам па жыцці
Ноч змушаюць дзень бясконцы
Адпусціць.

Летні сон дрыготкай хваляй
Лёг на плечы цішыні,
І у свеце меней стала
Мітусні.

* * *

*Дзень прайшоў незаўважна*
*і скончыўся нечакана*

Што было недасяжным
сталася наканаваным
тычыцца пераважна
літасьці існавання

Цяжка не навучыцца
жыць у чужых парадках
робіцца простай звычкай
бачыць адны пачаткі
зладзіўшы годны выгляд
не шкадаваць працягі
тут прыхаваць агіду
там закапаць адвагу

Зыбкую раўнавагу
проста зусім не бачаць
моляцца ж бедалагі
каб не было іначай

Вольны ідзе на волю
кволага неба кліча
кожны прыдбае долю
кожны сваё залічыць
некаму трэба заўтра
некаму трэба болей
некаму чыстай праўды
некаму ўжо даволі
восень канчацца мусіць
сёлета не захоча

Раніцу дзень адпусціць
новая выйдзе з ночы

Вечарам будзе вечар
гэта здзівіць не можа
вечнасць пакуль што вечна
спіць у хвіліне кожнай.

* * *

Падарыў сусвет
свой чарговы дзень
таму, каму хацеў,
Паказаў шляхі
на ўсе бакі,
хто можа — хай ідзе.
Ды сказаў не ўсім дзе чакае ноч,
ці ж трэба тое вам?
І спытаў — як тут? Хтосьці бачыць цуд?
Ці я застаўся сам?

Пачакаў сусвет,
покуль спадзеў быў
на правільны адказ,
Ды паклікаў ноч,
што брыла наўзбоч,
засведчыць новы час.
Дзень застаўся там, дзе пачатак сноў
даў справам адпачыць,
Там, дзе час, цячэ нарадзіць яшчэ
для прышлага прычын.

***

Дні змяняюцца, як заўсёды,
Сонца робіць кругі звычайныя.
Разуменне не надыходзіць,
Нават мэта не вызначаецца.

А жукі ўжо супольна з жабамі
Свежай верай нястомна душацца,
Ім няўцям, што жыццё нязграбнае
Толькі ўпоперак і варушыцца.

Вабіць рух, і ніякай розніцы,
Што пачаткі з канцамі зблыталі.
Сэнс быцця захапляе позамі,
Імітуючы змены спрытныя.

Пакаленні здзіўленне ведаюць
І, скалечыўшы розум планамі,
Маюць лёс — быць сабе ж суседзямі
Недарэчнымі і паганымі.

Дні змяняюцца, як заўсёды,
Сонца робіць кругі звычайныя.
Разуменне не надыходзіць,
Нават мэта не вызначаецца.

***

*Што я хацеў бы ведаць пра жыццё*

Хацеў бы ўжо дазнацца ад жыцця:
па-першае — куды яно дзяецца,
што ад яго у свеце застаецца
і хто на што якое спадзяецца,
па-свойму разумеючы працяг.

Калі сляды кідаеш на мяжы,
не даўшы рады лёгка пераскочыць,
не здолеўшы ужо зваротна крочыць,
а толькі прыпыніцца альбо збочыць.
І марна разумнець, і проста жыць.

***

*Памяць пра ўсё*
*складаецца з выпадковых фрагментаў*

Атуляе душу
галасамі з бязмежжа,
не знаходзячы мэты,
губляецца страх.
Напамінам жыццю
пра яго непазбежнасць
новы дзень пачынае
знікаць у вяках.

***

Ёсць адкуль ісці, а пойдзеш куды?
Ёсць чаму, але навошта — няўцям.
Мы не звыклыя да доўгай хады
Пуцявінамі такога жыцця.

А давай я табе дапамагу…
І давай мы дапаможам яму…
Трэба толькі пераставіць нагу
Праз сляпую і тупую зіму…

Шлях агораем усе пакрысе,
А не зможам даць сабе перадых —
новы дзень пытанняў новых нясе,
дзень учорашні пакінуў старых.

Ды і сёння — каб зусім, дык ніяк.
Вечар вечарам, а сон не ідзе.
Будзе кожнаму дарога свая,
Ды ці ж будзе клёк у кожнай хадзе?

***

Думка была тупая,
потым прыйшла другая.
Глянула — мала месца,
вось і не застаецца.

ёй
трэба сэнс і воля
ёй
трэба нават болей
ёй
трэба быць сабою
ёй
трэба каб з любоўю

Скуль я вазьму ёй клёку,
тут самому нялёгка.
Хай сабе ўцякае
думка мая другая.

***

Сны свае прыхавала ноч
Ад няздзесненых спадзяванняў
У спустошаны збан чакання,
Дзе глядзець не ўмеюць вочы.

Дзе не здолеюць быць сабой
Ні здзіўленні, ні захапленні,
І жыцця не дадуць імгненням,
А вякам не дадуць збавення
І, у шчырым сваім натхненні,
Нам усім папсуюць настрой.

***

Вяртанне да нармальнасці
Яшчэ не ў перспектыве.
Даніна актуальнаму
Няшчадна траціць сілу.
Не верыць зразумеламу
Нарэшце маем права.
Не вымагае смеласці
Надзённая забава.
Калі б шляхі не блытала,
То і не існавала б.
Нягеглай і няспрытнаю
Пакуль што мара стала.

***

Вечар ночы аддаў мары новага дня,
Іх да раніцы хопіць і думкам, і снам.
Безліч здзіўленых песень складзе цішыня,
Але толькі адна заспяваецца нам.

Рэфрэн (Можа быць які заўгодна)

Над халоднай зямлёй неба зоркай міргне,
Падхапіўшы самоту пякучай начы.
Ветрык ціхія словы забраў ад мяне,
Каб іх ранкам спяваць у цябе на плячы.

Рэфрэн (Можа быць які заўгодна)

Новы дзень атуляе святлом і цяплом,
Успаміны губляюць і вечар, і ноч;
Песня нашая птушкай стае на крыло
І высока ляціць, і сканчацца не хоча.

Рэфрэн (Можа быць які заўгодна)

***

Мой цень не ведаў, куды пайду,
Мой цень паблытаў маю хаду.
Мой цень падумаў не так, як я,
Мой цень прымусіў мяне стаяць.

Мой цень праверыў мае кішэні,
Мой цень пахерыў мае рашэнні.

Мой цень паўсюдна сябе шукае,
Мой цень нічога свайго не мае.

Мой цень паверыў, што дзень бясконцы.

Мой цень хаваўся за мной ад сонца.

***

Танец на ўзгорку
навакольнай вясной —
Бачаць толькі зоркі
першы крок, новы рух.
Таму вось і ззяюць
нам святлей удвая.
Пакуль што не важна,
хто тут ты, дзе тут я.

Танец на падворку
не зважае на ноч —
Дзіўная гаворка
набліжае фінал,
І срэбра ў зялёным
нехта знойдзе пасля
Пад згадкай адгадкі —
хто тут ты, дзе тут я.

***

Дарога, развеяўшы пыл,
Прастуе ускрайкам жыцця.
Туды,
Дзе я колішні быў,
Ідзе.
Толькі так,
    нехаця.
Там тое, што зладзяць са мной
Узніклыя раптам гады,
Туды —
Гэта быццам дамоў,
Але ж ці мне трэба
Туды?

## Паралельнае бязмежжа

Хавае сэнс зваротны бок люстэрка,
Калі, прывыкшы не зважаць на час,
Бязмежнае, па самых сціплых мерках,
Яго нутро нахабна бачыць вас.

Хавае сэнс зваротны бок люстэрка,
Калі скрозь права не зважаць на час
Бязмежнае, па самых сціплых мерках,
Яго нутро нахабна бачыць нас.

***

іншы горад з даўных мараў паўстае
ён упэўнены што мары не мае
ён не ведае ці трэба мне туды
дзе паблытала дарогі і гады

іншы горад на мой розум паляваў
не даваў каб чула сэрца галава
непакоіцца па дробязях вучыў
вырашаць не разглядаючы прычын

іншы горад часам робіўся бліжэй
мякка клаўся ладнай дуляй у кішэнь
надзяляў усмешкай твары проста так
быў здавалася вышэй усіх адзнак
.........
іншы горад паратункам паўстае
іншы горад разбурае сны мае
іншы горад прапануе іншы час
іншы горад пазбаўляе век ад нас

***

Горад твой так далёка,
У горад твой шлях нялёгкі.
Я іду, як умею,
як магу, разумею
патроху
дарогу.

Твой горад мне спакою не дае,
Праз сон мяне гукае і чакае,
А я наяве кожны дзень шукаю
Нагоду залагодзіць сны мае.

Твой горад мне знаёмы быў даўней,
Твой горад наўзаем любіў мяне,
Штодня сваімі вулкамі вадзіў.
Я быў у тваім горадзе адзін.

Мінае час, стаміўшыся здзіўляць.
Аднолькавыя думкі кожны дзень.
На шлях, які ў твой горад прывядзе,
Зямля мяне выводзіць спакваля.

На шлях, які ў твой горад прывядзе,
Пакуль што паглядаецца здаля.

***

*Мы дзелім мары спрэс на спадзяванні*

Падзеляць мары час на спадзяванні,
Падмануць розум і чарговы раз
Пакінуць нас у задуменным стане...
Глядзець, як ПАМЯЦЬ забірае час.
Глядзець, як памяць забірае ЧАС.

***

З-пад шэпту ранішняга снегу
глядзіць на свет маё здзіўленне —
шчыруюць альфа і амега
па адмарожаным камені.

Бывае, позірк іх чапляе,
не даўшы рады затрымацца,
яны нікуды не знікаюць,
яны ніколі не хаваюцца,
яны за славаю не гоняцца,
яны не хочуць памяняцца,
яны належаць завядзёнцы.

Пад шэптам ранішняга снегу
утульна спаць майму натхненню,
расклаўшы альфу пад амегу
на адмарожаным камені.

***

Сонца ўстала, сонца села,
беглі дні, гады ляцелі,
галава не разумнела,
ход шляхоў не выбіраў.
А пасля жыццё сказала,
што прыслухацца пара —

чуеш, як міргаюць зоры,
чуеш, думаюць азёры
і праз сон шапочуць дрэвы,
супакоіўшы вятры?

Чуеш, хоча неба плакаць?
Чуеш, сэнс ідзе ў сраку?

***

Гадзіны ходзяць па прасторы,
Прастора круціцца ў хвіліне,
Блукаюць прывіды гісторый
Па пераблытаных прычынах,

Што плён у клопаце згубілі,
Што мару пакрышылі ў сорам
І, сэнс хаваючы пад пылам,
Здзіўляюць стомленым дакорам.

Гадзіны ходзяць па прасторы,
Прастора круціцца ў хвіліне,
Блукаюць прывіды гісторый
З часоў, як розум іх пакінуў.

***

Скрадаюць вятры ў дарогі
няўрымслівы пыл.
І дзеляцца шчодра з лістамі
вакольных кустоў...
У дарогі пустой
да вятроў узнікаюць пытанні.
Пытанняў тупых
не прагнуць вятры на дарозе.
Яна і маўчыць.

***

*Лепш за ўсіх маўчыць той,*
*каму ё што сказаць*

Бывае, розуму не трэба, каб пачаць
І непазбежна перайсці у новы час.
Мы паспяхова вучымся маўчаць,
А дзеці робяцца старэйшымі за нас.

***

З прасторы ў час галоўны ход,
А далей — воля хваль...
Бывае, што наадварот...
Па-рознаму бывае...

***

З'елі сораму вочы,
Раскрываючы карты,
Не крыўдуючы моцна
На тупых і упартых.

Навакольную багну
Ушчыкнуўшы паглядам,
Вочы літасці прагнуць,
Прагнуць вочы спагады.

Сёння бачылі вочы,
Як пачаўся учора
Выхад з цеснае ночы
У абдоймы прасторы,
Дзе тупых і упартых
Разуменне атуліць,
Што ім цесна на старце,
Што яны не стартуюць.

***

Небам накрытая,
Мерзне зямля.
Свеціцца зорамі
Цемра вышынь.
Цесна ў сярэдзіне,
А па краях
Справа не знойдзецца
Кожнай душы.

Часам падмануты,
Круціцца год,
Мара не месціцца
У паварот.

Дзень пахне вечарам
Снегам і сном.
Дзе прыпыняемся,
Там нам і дом.

***

Ходзім дарогамі
Мерзлай зямлі,
Ледзьве знаёмыя
З мэтай хады.
Толькі учора
Нас мары вялі
Проста да ночы,
Сцяўшы уздых.

Дзень недаверліва
Глянуў і збег.
Вечар адмервае
Шлях да сябе.

Мапа вандроўкі
Лягла за вакном.
Дзе атрымаецца,
Там і жывём.

***

Незадаволенасць шэрасцю неба
Кпіць, пазбаўляючы сэнсу развагі,
Час прыпыняе без пэўнай патрэбы
І не дае разабрацца з працягам.

Месціцца холад у цёплым пакоі,
Спрытна займаючы лепшыя месцы.
Мары мае не былі пра такое,
Але інача́й не будзе, здаецца.

Вуліца рве на кавалкі паветра,
З хаты мяне выклікае упарта.
Варта, прысеўшы у кут непрыкметны,
Ціха праспаць немінучае заўтра.

***

*Вагнер*

Бязважкай музыкі сляды
Спускаліся з вышынь,
Сплывалі гукі, нібы дым,
Па позірках душы.

І там, дзе некалі было
Утульней і прасцей,
Няпэўным сталася святло
Няветлівых надзей.

І у чаканні новых сноў
Стаміўся тлумны дзень,
І пачынаўся вечар зноў
Для кожнага з людзей.

І думаў кожны пра сваё,
Уласны чуў матыў,
І марам дыхаць заняло
Ад клопатаў пустых.

**Перадкалядны**
**23**

Імгненнямі калейнага жыцця
Мяняецца чарговая эпоха —
Не з тымі, каго можа напалохаць,
А з тымі, хто збіраецца пачаць.
Хто выслухаў мудрэй, чым распавёў.
Хто мітусню прароцтваў і намёкаў
Мінуў.
І, адышоўшы недалёка,
Паверыў, што вяртаецца дамоў.

***

Куды сыходзіць час, які не быў пражыты,
Куды дзяе сусвет нязбытыя гады,
Калі сухі разлік змяняецца малітвай,
Калі мяняе смак глыток сырой вады?

Куды вядуць шляхі, што розум абыходзяць,
Сціскаючы ў кулак прастору і святло?
Навошта там парог, які вартуе злодзей,
Навошта тут ізноў не тое, што было?

Пазбегне сэнсу дзень, які не верыць ночы,
Мінуламу няўцям, хто памяць разбурыў,
І хто не змог ісці, і хто паўзці не хоча,
Хто тэрмінова згас, а хто пакуль гарыць.

Часовых гарадоў нязвыклай формы хмары
Раднеюць не хутчэй, чым сон бярэ сваё.
Мы у чужых людзей сабе купляем мары,
І у чужых дамах мы з марамі жывём.

***

*? ці па* по ...

па-за шэрагам звычайных падзей
то ляціць мой час то ціха плыве
хто там ведае як будзе далей
ці савой па пні ці пнём па саве

тым што бачу як старэе зямля
не хачу дурыць сабе галаву
хто там ведае як будзе пасля
ці савой аб пень ці пнём аб саву

***

*Arthur Schopenhauer*
*„Ausser Idioten gibt es*
*fast niemand auf der Welt...“*

Яшчэ не вера, але ўжо надзея.
Яшчэ не крок, але хоць нейкі рух.
І што?
... пакуль люблю я шчыра свой катух,
Бо ў ім няма таго, што дурні дзеляць.
А тыя з іх, хто нюхам час адчуў,
Так мітусяцца, што губляюць спіны.
Я ж даў бы шмат,
каб зведаць што хачу
І збіць імпэт з нагодаў і прычынаў.

**Вершык перадкалядны**

Што трэба для дзіва? Дзядулеў кажух,
Шматочак ад сёння, з мінулага дух.
Ад заўтрага жменьку па гусце ўкладай,
Аскепак прасторы дадасць небакрай.

І дзіва урэшце адбудзецца тут,
Бо адрас і шлях добра ведае цуд.
Дарадцаў не трэба яму і дарма,
Ён ёсць нават там, дзе нічога няма.

Аднойчы сыходзячы ў нетры начы,
Няіснаю знічкаю зорку ўключы.
Ты чуеш, як свет яе позірк апёк —
Люстэрка зваротны паказвае бок.

***

Пастаў за дзверы чобат і чакай,
Схавай надзею у чарговы сон.
Пакуль ты спіш, тут ціха пройдзе ён —
Дзядуля ўсіх унукаў, Мікалай.

***

Падумай пра Святога Мікалая
Не толькі напярэдадні зімы,
Калі пра падарункі марым мы,
Якія звыкла ад яго чакаем.

Чакаем як бацькі і як дзяды —
У нас, як і у іх, ідуць гады,
Як і яны, мы Мікалая просім,
Каб падарункі кожны год прыносіў.

Падумай пра Святога Мікалая,
Пра тое, як ён руціцца вякамі
І у адказ нічога не чакае.
Па-іншаму ніколі не бывае.

Так важна, каб і дзеці, і унукі
Спасціглі гэту важную навуку,
Засвоілі аднойчы назаўсёды —
Дары і не чакай узнагароды.

*Нараджэнне аптымізму*

Чарговае лета прасранае
Панесла усмешку ў нябыт.
Ці варта чакаць нечаканага,
Ці варта высновы рабіць?

Не хочацца вечарам вечара?
Хацелася б іншы настрой?
Дык гэта ж праблемы не вечныя,
Другіх прычакаем зімой.
Сапраўдныя прыйдуць зімой.

**Дзівасіл**

Кветку, пасланую Сонцам на бераг ракі,
Пояць русалкі гаючай гарачай слязой.
Жоўтыя плямкі бліскучым халодным лязом
Рух адсякае, бо час ужо плесці вянкі.
Новае кола чакае з’яўлення вагню,
Дымам да сонца павернецца звон залаты,
Вецер скіруе у неба чароўны уздых,
Сполах трывогі раптоўна парве цішыню.

Павядзі мяне, Дзівасіл,
Пакажы мне, як робіцца дзіва.
Беражы мяне, Дзівасіл,
Шлях далёкі хай будзе лёгкім.
Барані мяне, Дзівасіл,
Ад варожага лютага вока.
Забяры мяне, Дзівасіл,
У чароўныя фарбы жніўня.

Сполах трывогі раптоўна ірве цішыню,
Вецер кіруе у неба чароўны уздых,
Дымам да сонца вяртаецца звон залаты,
Новае кола праклала дарогу вагню.
Жоўтая кветка змяняе мой свет пакрысе,
Я да сябе яе лёгкай рукою тулю.
Крэпка трымае карэннем памоцным зямлю,
Сілай дзявятай каханне насустрач нясе.

***

Здзіўляе праўдай навакольны тлум
У пошуках трывалага прыстанку.
Па перажытай будучыні сум
Не адмяняе заўтрашняга ранку.

***

*....?*

Ці варта высвятляць, хто з нас дурней
тлумачыць сэнс вакольнага жыцця?
Ці варта лёс шукаць сярод надзей
паўсюль — ад здабыцця да забыцця?
Ці варта ведаць нешта лепш за ўсіх,
каб без памылак выйсці за мяжу?
.........................................
І менавіта вось у гэты час
пытанне на пытанні у адказ
сабе прыдумаў,
вам не раскажу.

***

Час помнячы цябе
Выдумаць сабе
Новую гісторыю

ты бачыш гэты дождж непазбежна ветлівы
праз бэзавы туман на досвітку прасеяны
кахаючы і мокнучы ідзі сваёй дарогай
згубі бадзёра ноч у раніцы знямоглай
дождж кідае вадой у агні ваконныя
прэч мокры парасон прэч часы шалёныя
глядзі на тое як упоперак шляхам
знаходзіць мэту вецер

Час помнячы цябе
Выдумаць сабе
Новую гісторыю

прабілі кроплі дрэвам і кустам
па дахах лісця ад начы халоднага
бяссонны тлум шукае выхад там
дзе святам сон не першы век валодае
і зразумее гэта лета толькі восень
калі яно не верыць памяці папросіць
аддаўшы сілу нечаканаму усходу
прачнецца сум і новы дзень народзіць
ён будзе твой і толькі твой і толькі моўчкі
тады калі яго убачаць вочы
чакаю я што ты мяне забудзеш
калі сустрэцца заўтра не захочаш
і пра мяне табе раскажуць людзі

Час помнячы цябе
Выдумаць сабе
Новую гісторыю

я буду там дзе буду сам выкладваць пазлы
знайшоўшы іх на берагах чужога лёсу
мне будзе добра хоць напэўна не адразу
і мне ніколі новых дзён не будзе досыць
давай бывай і не жадай маіх паглядаў
бо я цвярозай галаве не падуладны
і я упоперак шляхам іду па свеце
туды куды здзімае мары свежы вецер

Час помнячы цябе
Выдумаць сабе
Новую гісторыю
Час помнячы цябе
Выдумаць сабе
Новую гісторыю

# ПЕРАСПЕВЫ

**Mistrzowie piosenki**
**Niepewność**
**(Adam Mickiewicz)**

Як ты далёка, праганяю слёзы.
Як жа ты побач, не губляю розум.
Калі сустрэцца нам не выпадае,
Новых спатканняў кожны дзень шукаю.
Вельмі хвалюе адказ на пытанне —
Ці шчэ сябруем, ці ужо каханне?

Смутныя думкі пры сабе трымаю,
Лепшае долі для цябе шукаю.
Колькі б па свеце ні насілі ногі,
Будзе твой ганак у канцы дарогі.
Вельмі хвалюе адказ на пытанне —
Ці шчэ сябруем, ці ужо каханне?

Калі цябе я многа дзён не бачу,
То падаецца: час бяжыць іначай.
Ты даражэй мне з кожнаю хвілінай,
Я ўжо ніколі цябе не пакіну.
Вельмі хвалюе адказ на пытанне —
Ці шчэ сябруем, ці ужо каханне?

Родныя рукі грэюць мне далоні,
Вось мы і разам, я ў тваім палоне.
Сніцца як быццам гэта нам з табою —
Б’юцца два сэрцы адно аб адное.
Вельмі хвалюе адказ на пытанне —
Ці шчэ сябруем, ці ужо каханне?

**W czarnej urnie**
**(Kult)**

Чорнай безданню міргае чорны век,
Кветку чорную маланкай чорнай б’е.
Чорны месяц чорны ранак перабег,
Чорны вечар несучы у дні мае.
Як у сне, мяняю золата на дым,
Нават сподзеў не застаўся залатым.
Ты не ты ужо, а чорная імгла —
Прамінулася, і дзякуй, што была.
Ці табе утульна ў думках, ад якіх
Тоіць сэрца шлях чырвонае крыві,
Рэшткі лёсаў, што жылі апошні міг,
Каб астатні раз мінулае здзівіць?

Ці ж нам можна зноў не бачыць звыклых сноў,
Ці ж нам варта верыць у падман?
Спее час на новы крок,
Час ісці пад новым небам,
Час, які не звяжа нас ланцугамі марных слоў.
Час дазволіць зноў не бачыць звыклых сноў,
Час дазволіць верыць у падман.

Час мінае, ці то тыдзень, ці то век,
І нішто яго з дарогі не саб’е.
Ад таго, што ён хаду змяніў на бег,
Карацеюць непрыкметна дні мае.
Прамінулае растала нібы дым,
Ад былога патыхае залатым,
Расступаецца апошняя імгла,
Сорам маючы за тое, што была.
Назбірала сэрца думак, ад якіх
Разганяецца гарачы бег крыві.
Быць апошнім не схацеў апошні міг,
Затрымаўся, каб мінулае здзівіць.

Як нам можна зноў не бачыць звыклых сноў,
Як нам варта верыць у падман,
Як нам можна зноў не бачыць звыклых сноў,
Як нам варта верыць у падман.

Ціхі тлумны голас твой
Горкім словам болей не кране.
Я у думках не з табой,
Ты ізноў не для мяне.

Час дазволіць не пабачыць звыклых сноў,
Час дазволіць верыць у падман,
Час дазволіць не пабачыць звыклых сноў,
Час дазволіць верыць у падман.

**It’s Impossible**
**(Perry Como, Sid Wayne)**

немагчымае —
сонца з неба не пусціць
аднойчы вечарам
немагчымае —
патлумачыць дзецям
глупства чалавечае

ці дазволіш ты
раннім ранкам
абдымацца
з новай сілаю
ці даруеш мне
што я думаць твае думкі
навучылася

як не побач ты —
свет становіцца пусты
губляе логіку
калі разам мы —
сонца з неба хай ідзе
сваёй дарогаю

непазбежныя
будуць роспачныя сны
паміж сустрэчамі
і нарэшце вочы ў вочы
летнім вечарам
і з часовага твой позірк
робіць вечнае

як не побач ты —
свет становіцца пусты
губляе логіку
калі разам мы —
сонца з неба хай ідзе
сваёй дарогаю

непазбежныя
будуць роспачныя сны
паміж сустрэчамі
і нарэшце вочы ў вочы
летнім вечарам
і з часовага твой позірк
робіць вечнае

немагчымае
непазбежнае

**Snow, Snow**
**(Pete Seeger)**

Сні снег сумны сон,
Сніся снег сабе ручаём.

З неба звечарэлага падаў снег,
Вецер раскладаў яго перад сном.
Зараз, як звычайна, снег засне
Са сваімі думкамі там, за вакном.

Сні снег сумны сон,
Сніся снег сабе ручаём.

Смеццем нацярушаным спачываў,
Лічбамі гадзіны свае не лічыў,
Рознага схаванага не рахаваў
І адсвечваў месяцу з нетраў начы.

Просты, нібы музыка, белы снег.
Ён дакладна ведае сэнс і лёс.
Зараз, як звычайна, снег засне
І у сне падумае пра сваё.

Снег сніў сумны сон,
Сніўся снег сабе ручаём.

**Yesterday, when I was young**
**(Charles Aznavour)**

Неяк дзень на свет глядзеў
І галаву схіліў пад тысячай хвілін.
Сляпая мітусня не шкадавала дня,
Імкнулася сказаць, каб не ішоў назад.
І вось усё бяжыць, няма нідзе мяжы,
І час рабіць прасцей, стаміўшыся цярпець.
Не марыцца ніяк — губляе мэта смак —
Штодзённай мітусні ніяк не адмяніць.

Неяк так. Адчуеш смак
Імгнення у вяках і сподзеў на працяг,
Калі няма нідзе на што вачам глядзець,
Шукаеш, як змяніць свае былыя дні,
Але ж яны сплылі са звыклае зямлі
Няведама куды, і гэта назаўжды.
Хто слова не знайшоў, хто не туды пайшоў —
Прыпомняць апасля па-свойму гэты шлях.

Неяк нас праносіць час
Прасторай для дажджу на выхад за мяжу.
З мінулага жыцця брыдзецца нехаця,
Здзімае вецер сны насустрач мітусні,
Губляецца сусвет у безлічы прыкмет,
Але перадусім не варта верыць ім.
Я не па іх блукаў, калі сябе шукаў,
Шкадуючы людзей, якімісці далей.

**Черный ворон**
**(Народная)**

Хадзіла восень па рудых пажухлых лісцях
І тлумам поўніла сівую галаву.
Усё не так, як планавалася калісці —
Жыву не так, не там, не з тымі я жыву.

Здаецца, што на новы крок не хопіць сілы,
Усё няправільна і перашкоды спрэс,
Але дарога не спыняцца навучыла,
Яна адна ніколі не губляла сэнс.

Няма парадку ў навакольным асяроддзі,
Зазначыць варта, што яго і не было,
Але ж канцы з канцамі кожны мусіць зводзіць
І адкладаць паціху нешта у кубло.

А калі збрыдзее сядзець на звыклым месцы,
Забудзь пра тое, што няма куды ісці —
Дарога побач кіламетрамі віецца,
Яна адна — твой верны сябар у жыцці.

Настаў каўнер і каўтані аскепкі суму,
Бязглузды клопат адпусці у забыццё.
Ідзі уперад і сур’ёзнага не думай
Пра чалавечае нягеглае жыццё.

**Рок-н-рольчык з 70-х**

за крокам крок
і за парог
а там працяг
жыццёвы шлях
напрамкаў многа
а сэнс адзін
знайсці дарогу
без каляін

сюды-туды
туды-сюды
падчас хады
лятуць гады
пасярод тлуму
штодня часцей
ды будзем думаць
пра ўсё прасцей

хай гэты час
убачыць нас
каб нам сусвет
глядзеў услед
каб нашай веры
было дзе жыць
і каб без меры
і без мяжы

**Gortoz a Ran**
**(J’Attends)**

Цяпер гады, даўней вякі
У шэрай вежы сіні цень,
У вежы шэрай сіні цень.

Насупраць дождж сцяной сівой
Наўсцяж кладзе сляды вады,
Кладзе наўсцяж сляды вады.

Гінуць хвалі ў глыбіні,
Неба ловіць мой узлёт,
Рэха бачыць усё наадварот.

Вятры лятуць з далечыні
Ламаць сцяну адвечных хмар,
Каб даць мне выйсце у абшар.

Цяпер гады, пасля вякі
Дажджы ліюць туды-сюды,
Вяртанне п’е сляды вады —
Гады - вякі - вякі - гады.

Гінуць хвалі ў глыбіні,
Неба ловіць мой узлёт,
Рэха бачыць усё наадварот.

**Tears in heaven**
**(Eric Clapton)**

Я спыніў свой шлях, ціха мару абарваў.
У пустых дзвярах хутка з’явіцца зіма.
Пакліч мяне, здзіві туман словамі
Пра надыход белага дня.

Маё неба там, дзе вясна ужо была,
Дзе твае імя зноў губляецца ў снах.
Мінае час, і толькі ноч ведае
Адзіны сэнс новага дня.

Каб нябесны час разам распачаць,
Варта і табе сон пра белы дзень
Паглядзець.

Мінае час, і толькі ноч ведае
Адзіны сэнс нашага дня.

Я спыніў свой шлях, ціха мару абарваў,
У пустых дзвярах усміхаецца зіма.
Пакліч мяне, здзіві туман словамі
Пра надыход кожнага дня.

**Historia de un amor**
**(Carlos Eleta Almarán)**

Часам бачу гэты сон – там толькі ты,
Па-за сном свет падаецца мне пустым.
І душа шукае месца,
І няма куды падзецца
Ад цябе і ад сябе.
Без цябе маё жыццё губляе дні,
Мару вечна я цябе кахаць і сніць.
Сэрца маё грэе
Цэлы час адна надзея –
Мець з табой адно жыццё.

Бачу вочы, і ў вачах
Нараджаеца свет
Невядомых новых зор,
І за імі ўслед
Паплывём на хвалі шчасця,
Не маючы мяжы,
Нам гісторыю кахання
Давядзецца пераҗыць.

**Риорита**
**(Пётр Тодоровский)**

Успаміны, успаміны
Не даюць заснуць,
Дзень праходзіць, час мінае,
А гады лятуць.

Мы шукаем, мы знаходзім
Важнае ў жыцці,
Апранаемся па модзе
Каб далей ісці.
Перастаўшы верыць казкам,
Шмат знаходзім тэм,
І не думаем, што шчасце
Насамрэч прасцей.

Каб было пра што успомніць,
Пошукі прыгод
То у клопаце нястомным,
То наадварот.
Б’е сівому чорт у рэбры,
Помніць сэрца боль —
Час забыцца, як патрэбна,
І пабыць сабой.

**Что так сердце растревожено**
**(М. Матусовский, Т. Хренников)**

Пра спакой у сэрцы думак не чакаецца,
Не знаходзіць сэрца свой спакой,
Калі, словы простыя шукаючы,
Спадзяюся, што сустрэнуся з табой.

Гэта сцежка, на якую памяць вывела,
Прыгадаўшы даўныя гады,
Наталяе сэрца тлумнай сілаю
І нясе мяне няведама куды.

Я спяю тваё імя на вуха вуліцы,
Рушу крокам сподзеву і мрой,
Усміхнецца свет і перакуліцца,
Калі выпадзе пабачыцца з табой.

І накрыюць нас вякі нябачнай хваляю,
І надыйдуць ночы новых сноў,
І пяшчотным зробіцца трывалае
Калі мы усё ж сустрэнемся наноў.

**Pomarańcze i mandarynki**
**(Marek Grechuta, Julian Tuwim)**

Святам пахне утульны вечар,
І самота у адпачынку.
Атачэннем дрыготкіх свечак
Марцыпанкі і мандарынкі.
Атачэнне дрыготкіх свечак —
Марцыпанкі і мандарынкі.

Так бязважка, так меладыйна
Мы знаходзім сабе прыгоды.
Цёплы вецер спявае дзіўна
І на вуліцу сны выводзіць.
Там бязважка, там меладыйна
Мы знаходзім сабе прыгоды.

Крок насустрач празрыстым марам
Варта скончыць павольным танцам.
Думкі цалкам належаць зараз
Мандарынкам і марцыпанкам.
Думкі цалкам належаць зараз
Мандарынкам і марцыпанкам.

Іншых сэнсаў няма наўкола,
Прыпыніцеся на хвілінку —
Бляскам золата вас натоляць
Марцыпанкі і мандарынкі.
Бляскам золата вас натоляць
Марцыпанкі і мандарынкі.

**Сиреневый туман**
**(М. Матусовский, Ю. Липатов)**

Той бэзавы туман у памяці развеяў
Самотнай зоркі свет, што ў тамбур зазірнуў.
Кандуктар, памаўчы, кандуктар, разумееш —
Расстання назаўжды нам сёння не мінуць.

Апошніх словаў соль нам вусны апякае,
Расстанне не на год і нават не на два.
Напэўна, назаўжды надзею мы губляем,
Кульгавы лёс прыйшоў нам сэрцы разарваць.

Дзе сподзеў, што яшчэ сустрэнуцца дарогі,
Дзе вера, што пасля скрыжуюцца шляхі?
Прашу цябе, забудзь былое дзеля Бога,
Жыві сваім жыццём і сумаваць пакінь.

Яшчэ адзін гудок старога паравоза,
Цягнік мяне павёз праз бэзавы туман.
За ім усё не так, там хутка сохнуць слёзы,
Там ёсць наступны дзень, а памяці няма.

**Громко лаяли собаки**
**(Г. Шпаликов)**

Вельмі зладжана сабакі
Брэхам рвуць бягучы час.
Атачыўшы пуза фракам,
Я спяшаюся да вас.

Так халодна і няўтульна
Раптам стала у жыцці.
Мне ад млявасці агульнай
Не хацелася ісці.

Вы ж сядзелі на канапе
І нагадвалі партрэт.
Нерашуча я палапаў
У кішэні пісталет.

Апусціўшы долу дула,
Праз кішэнь ён мог страляць.
Я ўсё думаў, думаў, думаў:
Забіваць — не забіваць.

Гэты дзіўны дзень асенні
Нам зрабіў усё, што мог.
Вы упалі на калені,
Я націснуў на курок.

Асляпіў мне вочы стрэлам
Свет рэальнасці другой,
Нежывое маё цела
Лёгка дрыгнула нагой.

**Окончен путь**
**(А. Дмитриевич, Ю. Бриннер)**

Звычайна ўсё, да смешнага звычайна,
Быў наш разлад не горш, чым у каго,
Чарговы дзень мінае хмурай тайнай,
Цяпла бракуе, дагарэў агонь.

Лятуць гады. Дзе іх сляды?
Даю натомленаму сэрцу адпачыць.
Няздзейсных мар ужо няма,
На марны пошук не знаходзіцца прычын.

Дні карацей, а ночы падаўжэлі,
На галаве маёй пануе сівізна.
І што пытаць — ці так мы жыць хацелі?
Прасцей маўчаць, прасцей не ўспамінаць.

**Увяли розы**
**(Народная)**

Я — сын кухаркі і лякальшчыка,
Быў я і коцікам, і зайчыкам,
Цудоўным сынам і выдатнікам
Так ганарылася радня.
А мне, курдуплю недаспеламу,
У местачковы парк хацелася,
Бо там гарэлка з папяросамі
І дзеўкі розныя штодня.

Пасохлі ружы, жыццё не дужа,
І так паскудна пачынаецца дзень.
Гады праходзяць, знікае сподзеў,
І птушка шчасця мне у рукі не йдзе.

Я піў і дозы павялічваў,
Я піў шмурдзяк, я піў “Сталічную»,
Я піў, нагоды не шукаючы,
Піў, ахвяруючы сабой.
Мне ўсё радзей бывае весела,
Бо п’янка — цяжкая прафесія,
Бесперспектыўная і сумная,
Як неўзаемная любоў.

**Vår I Dalarna**
**(Stefan Sundström)**

у час расплюшчыць вочы патрабуе ранак сёння
але ж хіба ён у нас
надоўга
новы дзень прыходзіць і пара старому
палічыць што нарабіў

ужо чакае вынік складзены з пытанняў вечных
і на ўсе адказ адзін
адзіны
той які не хоча ні ўдзень ні ўночы
быць пачаткам забыцця

нам нарадзіцца быццам стала справай звыклай толькі
як забыцца думаць пра
набыткі
зробленай з падману кволае пашаны
няўпэўненых людзей

і покуль ім патрэба торкаць пальцам неба тупа
і тлумачыць мэту тым
ці гэтым
каб здавацца новым сэнс забраць у слова
і упарта не чакаць

а мы глядзім ды бачым як натоўп тупоча міма
даганяць яго бадай
не варта
ні хацець нагоды ні шукаць прычыны
песціць сум і множыць тлум

і каб здабыць дарогу у шляхах нязвыклых марных
дзе згубіць пачатак так
няцяжка
скалаціўшы поле выхадам на волю
моўчкі плюнуць за плячо

у час расплюшчыць вочы патрабуе ранак сёння
але ж хіба ён у нас
надоўга
новы дзень прыходзіць новы дзень праходзіць
зноў нічога не паспеў

**Barnatro**
**(Ejnar Westling)**

Час пачуўся, мы пайшлі
Ва усе бакі зямлі,
Каб натрапіць хто на мэту,  хто на лёс.
Кожны мроіў, як умеў,
Быў у кожнага намер,
Кожны рос, але не кожны разумнеў.

Першы крок. Новы крок.
Уперад ён, назад ці ў пэўны бок.
Новы крок. Першы крок.
Губляецца у тысячах дарог.

Смак крутых дзіцячых мрой
І рашучы свой настрой
Раскідаць знайшлі магчымасць па жыцці.
Важкіх справаў марны сэнс
Адмяніў агонь вачэй,
Навучыў за ўсё, што маем, заплаціць.

Штосьці з марамі не так,
Марым мары абы-як,
Часам цяжка разабрацца, дзе чые.
Зрэшты, кожнаму сваё,
Вынік розны дастаём,
Нам пытанняў да адказаў не стае.

Новы крок. Кожны крок.
Уперад ён, назад ці ў пэўны бок.
Кожны крок. Новы крок
Губляецца у тысячах дарог.

**Uti vår hage**
**(Svensk folkvisa)**

Ліпеньскі вечар чакае цябе,
Мой сад цвіце,
Кветкі склікае ў чароўны букет:
Лілею і аквілею,
І ружы сярод шалфею,
Салодкую мяту табе адной.

Танчыць у кветках апошні прамень,
З яго святлом
Рукі  і вочы кладуць у вянок
Лілею і аквілею,
І ружы сярод шалфею,
Салодкую мяту табе адной.

Я узнясу на твае валасы
Стракаты цуд,
Сонечны знак патаемных надзей:
Лілею і аквілею,
І ружы сярод шалфею,
Салодкую мяту табе адной.

Зробяцца праўдамі мары і сны
І прыйдзе час,
Кветкавай песняй узрадуюць нас
Лілея і аквілея,
І ружы сярод шалфею,
Салодкая мята.
І я з табой.

# КАЗКІ

**Кот і ліса**
Беларуская народная казка

Жыў ды быў на свеце беспрытульны Кот,
Неяк яму ў вёсцы кепска ўсё ішло.
Кот аднойчы ранкам пералез праз плот,
Каб сабе у лесе прышукаць жытло.

І жытло знайшлося пад сівой страхой
Крывенькае хаткі без гаспадара.
Там мышэй уволю і душы спакой,
А ў кустах за хлевам нейкая нара.

Там жыла Лісіца, і праз колькі дзён
Стала ўжо цікава — хто ж яе сусед,
Падышла, спытала, мовіў грозна ён:
—Катафей, вядомы хіба ж на ўвесь свет.

З самага Сібіру ў ваш дасланы лес
І за ваяводу буду тут цяпер.
Буду валадарыць і парадчыць спрэс,
Мусіць мяне слухаць кожны птах і звер.

—Вы такі сур'ёзны, — Лісанька ў адказ, —
Але ж Вам да шчасця жонкі не стае.
Я ж на гэты момант вольная якраз,
Будуць Вам падтрымкай здольнасці мае.

Зладзілі вяселле, зажылі, і вось
Нейк з палявання йшла Ліса дамоў.
— Аддавай здабычу, — ззаду кажа хтось.
І навіс над ёю грозны шэры Воўк.

—Як паклічу мужа, дасць табе адказ!
З лютым Катафеем хочаш справу мець?
Ён тут ваявода, ён галоўны ў нас,
Так што лепш не каўкай, бо ў шматкі парвець.

—Ой, прабачце, Ліска, я ж не ў курсе быў.
Вы, зрабіце ласку, пазнаёмце нас.
—Каб ён табе, дурню, пысу не разбіў,
Ахвяруй барана заўтра ў гэты ж час.

Толькі Воўк адбегся, як Мядзведзь узнік.
Быў паўтор размовы, ды на гэты раз
Для ахвяравання называўся бык,
Тут яго чакацьмуць заўтра ў гэты ж час.

Надыходзіць заўтра, і Мядзведзь з Ваўком
Выклалі ахвяры пры ўваходзе ў лес.
Воўк схаваўся лоўка побач пад кустом,
А Мядзведзь на дрэва вельмі спрытна ўзлез.

І сядзяць, чакаюць — прыйдзе Катафей,
Як не падманула хітрая Ліса.
Ён наесца мяса, зробіцца дабрэй,
Спакайней так будзе языка часаць.

Знудзіла чаканне — хочацца ж хутчэй!
Наказалі зайцу: «Збегай нагадай!»
Хутка, вельмі хутка проці іх вачэй
Нехта невялічкі голасу падаў.

Але ж голас моцны, бы з нябёсаў гром,
Сквапна і нахабна працінаў мазгі —
Цяжка ў гэткай справе роўным быць з катом,
Кот умее гэта, як ніхто другі.

Мішка — ходу з дрэва, кінуўся наўцёк.
Воўк дрыжыць ад страху у сваіх кустах,
Катафей, зірнуўшы на кусты здалёк,
Думаў — тамка мышы танчаць на хвастах.

І, зароўшы нема, на хмызы ляціць,
Але ж прыпыніўся згледзеўшы ваўка:
Трэба разбягацца, кожны хоча жыць.
Ліска ж мужу кажа: —Хопіць уцякаць!

А Ваўку з Мядзведзем выгукнула ўслед:
—Я яго трымаю, драпайце хутчэй!
Чуткі з таго часу поўняць белы свет —
Надта ж ужо грозны гэты Катафей!

І Каток з Ліsіцай рушылі дамоў,
Бо прыдбалі харчу на усю зіму.
Так да іх нарэшце дабрабыт прыйшоў.
Кажуць, што дагэтуль весела жывуць.

**Каваль і Аднавокае Гора**
Беларуская народная казка

Шчаслівы чалавек меў трох сыноў —
Адзін Шавец, другі Кравец,
А трэці дык Каваль.
У згодзе на прыродзе час ішоў,
Ніхто ні крыўды не трымаў,
Ні гора не спазнаў.

Аднойчы пры сняданку нехта з іх
Спытаў бацькоў — ці можам мы
Няшчасце зразумець?
І гоман за сталом раптоўна сціх,
Узнікла думка — пашукаць,
Дзе злыбяда жывець.

Дазнацца у людзей сыны пайшлі —
Ці ёсць бяда, ці гора ёсць,
І калі ёсць, то дзе.
Вось да карчмы іх ногі прывялі —
І там было нямала тых,
Хто жыў не як хацеў.

Казалі людцы кожны пра сваё —
Тут неўраджай, а там ваўкі
Здрапежылі кароў,
А тут мядзведзь ганяе пчаляроў.
Ды гэта ўсё братам няўцям,
Вяртаюцца дамоў.

І толькі адышліся ад карчмы,
Як з-за куста нагнала ноч
Разбойнікаў на іх,
Ды не ўдалося хлопцаў прышчаміць —
Прабеглі полем і ўцяклі
Па сцежачках лясных.

Паўстала раптам хатка на шляху,
Валун вялізны ля дзвярэй
Прыйшлося абмінуць.
Там тры авечкі спалі ў катуху,
Агонь у печы грэў абед —
Нарэшце пад'ядуць.

Ды бачаць — нейкі боўдзіла ў дзвярах,
Глядзіць на іх нядобра так
Адзіным вокам, гад.
Братоў ласкава просіць пачакаць,
Пакуль залатвіць колькі спраў
І вернецца назад.

Вярнуўшыся, ён будзе есці іх —
Сказаў. І камнем заваліў
У хатку уваход.
Імпэт у юнакоў раптоўна знік:
Ніхто з іх, пэўне ж, не чакаў
Тут гэтакіх прыгод.

І паратунку быццам бы няма.
Вось так прапасці ні за грош
І згінуць назаўжды!
І ўжо пякучай крыўды не стрымаць:

Што будзе, калі той балван
Павернецца сюды?

Трывожны час прымаў марудны ход,
Ды вось нарэшце гад прыйшоў
І ва ўваходзе стаў.
Пачаў братоў дапытваць — хто ёсць хто.
Шавец — у печ, Кравец — у печ.
А Кавалю сказаў:

— Завуся Аднавокім Горам я.
Вакольным людзям шмат бяды
Сабой я нарабіў.
Пара прыйшла маё жыццё мяняць.
Таму яшчэ адно, Каваль,
Ты вока мне прабі.

Каваль яму: — Ніякіх тут праблем —
Давай вяроўку і нясі
Калёны востры штых.
Ўсё будзе нават лепш, чым ты хацеў, —
Бо абазнаны майстра я,
Што да вачэй такіх.

Звязаў ён Гора ды нагрэў штыха,
І аднавокага сляпым
Зрабіў адзін укол.
Ад Каваля каварства хто ж чакаў —
Той, што на ўсіх наводзіў страх,
Сваю бяду знайшоў.

Завыла Гора, уздыхнуў Каваль —
Братоў ужо не ўратаваць,
Таму дамоў пара...
— Маю сякеру толькі не чапай —
Пачуў хлапец шалёны крык,
Выходзячы з двара.

Ён азірнуўся, бачыць — там на пні
Ляжыць сякера і блішчыць,
Вачэй не адарваць.
А ў галаве гучыць — давай, сцягні,
Хаця, канешне, лепш было б
Сякеру не чапаць.

Не удалося нават зварушыць,
І з тапарышчам назаўжды
Счапілася рука.
А Гора асляплёнае бяжыць,
Крычыць: — Ага! Сырым зжару!
Ці ж мае сэнс чакаць?!

З кішэні дастае хлапец нажа
І, развітаўшыся з рукой,
Наўходала імчыць.
Сляпое Гора нават напужаць
Яго не здолее цяпер,
Не тое што спыніць.

Хоць як, але ўдалося ацалець.
Не схоча гора ўжо шукаць,
Упэўніўся хлапец —
Шляхі да ліха лёгкія, але
Дарога тая іншы раз
Вядзе ў адзін канец.

**Жораў і Чапля**
Беларуская народная казка

Пры канцы балота Жораў жыў самотны,
Чапля хатку мела на другім канцы.
Вось аднойчы Жораў абувае боты,
Каб да тае Чаплі сватацца ісці.

Восем вёрст балотам, дзесяць крокаў борам,
Ля варот спыніўся і ў двор крычыць:
— Гэта я, сусед ваш, нежанаты Жораў!
Ці не хочаш, Чапля, маёй жонкай быць?

— Ты, цыбаты ёлуп, надта ж непрыгожы,
Хай бы заставаўся там, адкуль прыйшоў!
— Што ж ты, баба, кажаш, хіба ж гэтак можна? —
І паклэпаў Жораў з крыўдаю дамоў.

Ды, сваю памылку зразумеўшы потым,
Вырушыла Чапля жорава шукаць:
Дзесяць крокаў борам, восем вёрст балотам —
Мусіць, ужо хопіць жыць без мужыка.

— Даражэнькі Жораў, маю прапанову:
Трэба табе жонка, дык мяне бяры!
І адказ пачула на такія словы:
— Што гэта ты робіш у маім двары?

Мне такой страшыдлы задарма не трэба,
Ад цябе з балота жабы уцяклі!
Чапля не ўтрымала слёз ад слоў ганебных,
Бегла і не чула пад сабой зямлі.

Ды прыпомніў Жораў, што хацеў жаніцца
І што на балоце выбару няма.
І пайшоў да Чаплі з мэтай павініцца
Ды на прапанову згоду атрымаць.

Восем вёрст балотам, дзесяць крокаў борам,
Ля варот спыніўся і ў двор крычыць:
— Гэта я, сусед ваш, нежанаты Жораў!
Ці не хочаш, Чапля, маёй жонкай быць?

— Ты, цыбаты ёлуп, надта ж непрыгожы,
Хай бы заставаўся, там адкуль прыйшоў!
— Што ж ты, баба, кажаш, хіба ж гэтак можна?
І паклэпаў Жораў з крыўдаю дамоў.

Зноў сваю памылку Чапля зразумела,
Пратаптаным шляхам пабрыла ізноў...
Так вось і хадзілі, так вось і старэлі,
Так вось бесталкова іхны час ішоў.

**Сава і Дзяцел**
Беларуская народная казка

Штурхала сонца па зямлі світанак,
А рэшткі цемры грукат шкуматаў —
Галодны Дзяцел працаваў ад рана,
Бо хлеб сабе надзённы здабываў.

Сава-суседка ноч адпалявала
І узялася сон старэчы сніць,
Ды што за грукат, што там за навала?
І вось ужо Сава з дупла крычыць:

— Ці ж ты хаця б маленькі розум маеш,
Шаноўны Дзяцел, дарагі сусед?
Кідай грымець, як я адпачываю,
Ідзі дамоў і сам паспі як след.

— Удзень паспаць? Не лепшая ідэя.
Удзень жыццё сапраўднае кіпіць,
А ноччу толькі мышак па-зладзейску
Табе, Сава, прыходзіцца лавіць.

Я у цябе даведацца хацеў бы —
Наколькі гэта цяжка для вачэй?
Як можна паляваць у поўнай цемры?
Пры сонечным святле куды ямчэй.

— Якое сонца, Дзяцел, што ты кажаш?
Хіба ж яго мы бачым, калі спім?
Яно мне падаецца недасяжным,
А можа, і няма яго зусім.

— Сама, Сава, ты розуму не маеш,
Не бачу сэнсу з гэтакіх размоў.
Практычна ўсе ўначы адпачываюць,
Апроч такіх, як ты, нягеглых соў.

— Нягеглым совам, браце, твае словы
Не даспадобы — будзеш шкадаваць, —
Яна сказала, скончыўшы размову,
І ў дупло схавалася паспаць.

Згубіла сонца прамяні за лесам,
Пара прыйшла і дзятлам адпачыць.
З-за нерухомых хмарак хітры месяц
Праз цішыню загадкава бліשчыць.

Ды раптам рогат жудасны, бязмежны:
— Куга! Куга! Ха-ха-ха! Гуў-гуў! —
Начны спакой нахабна раздрапежыў,
І не было таго, хто не пачуў.

Прадзёршы вочы, поўны страху Дзяцел,
Раззявіў дзюбу і заскавытаў:
— Здаецца, ты, Сава, не ў адэкваце,
Ідзі паспі, сівая свалата.

— Ды не, браток, не хачу спаць уночы!
Мы для цябе і ўсёй тваёй радні
З сястрыцамі такога нарагочам,

Што вам ніякай ноччу не прысніць.

І з кіслай мінай на прыпухлым твары
Азяблай дзюбай Дзяцел варушыў:
— Ну, пачакай, лупатая пачвара,
Ты атрымаеш заўтра ад душы!

І дзень пры дні, і ноч пры ночы роўна
Ад тых часоў ні Дзяцел, ні Сава
Адно аднаму не даюць спакойна
Ніколі ні дняваць, ні начаваць.

**Як дзяцел спагнаў сваю злосць**
Беларуская народная казка

Звіў сабе дзяцел гняздо,
Выседзеў дзетак з яечак.
Радасна думаў: ужо ж
Будзе падтрымка пад старасць.
Так бы яно і было,
Дзяцел як мог клапаціўся,
Толькі вось трэба заўжды
Цешыцца шчасцем маўкліва.

Але не быў бы ён дзятлам,
Каб не трубіў на ўвесь лес,
Што хоча зладзіць гулянку
Для усяе грамады...

Слаўна радзіны адзначыў.
Па пачастунку такім
Тлумна шукалі дарогі
Госці да хатаў сваіх.

Розгалас поўніў лясы —
Дзяцел такі малайчына!
Гэта пачула ліса
І закіпела ад злосці:
— Ну, пачакай жа, дзівак!
Дамся табе я у знакі.
Мог бы пазваць і мяне —
Бачымся ж кожнага ранку.

Хутка прыдумала помсту:
Выгляд зрабіла такі,
Нібыта дрэва, дзе дзяцел
Жыў і выхоўваў дзяцей,
Ёй тэрмінова на дровы
Секчы патрэбна, таму,
Люта ашчэрыўшы ляпу,
Хлешча па дрэве хвастом.

— Няма чаго болей рабіць?
Дзетак пужаеш навошта?
— Гэтае дрэва маё
Ты засяліў самавольна.
Я ж менавіта яго
Секчы планую на дровы.
Што ж да дзяцей, для цябе
З вопыту маю параду.

Ты пры сабе не трымай іх —
Так яны спесцяцца ўшчэнт.
Ты іх аддай у навуку,
Каб у грамадстве раслі.
Іх прызвычаяць да працы.
Вось і на старасць сабе
Так забяспечыш падтрымку.
Як табе гэткі расклад?

— Мусіць, што праўда твая,
Але ж каму даручыць іх?
— Можаш мяне папрасіць,
Я іх прыстрою надзейна.

— Як жа за ласку тваю
Мушу табе я аддзячыць?
— Тут ужо вырашыш сам
Гэта па выніках справы.

Вось ужо першы дзіцёнак
Трапіў у лапы лісе,
З'ела яго у лагчыне,
Дзятлу сказала: — Ну вось,
Здала у добрыя рукі,
Вучыцца на каваля.
Там і другога чакаюць —
Зробяць яго цесляром.

І, падхапіўшы малога,
З'ела ў кустах і таго.
А як прыбегла за трэцім,
Кажа: — Зраблю бандаром.
Дзяцел аддаў і падумаў:
— Трэба аддзячыць лісе.
Ладна прыстроіла дзетак,
Сам бы я рады не даў.

Гэтым жа часам ліса,
Добра пад'еўшы, ікнула
Ды падышла да гнязда.
— Ну, калі болей не маеш,
То пацалуй жа пад хвост,
Бо накарміў мяне смачна —
І, не хаваючы смех,
Знікла з вачэй назаўсёды.

Дзяцел глядзеў ашалела —
І шкадаваў, і злаваў.
Плакаў у роспачы горка.
Марыў пра помсту, але ж
Тую лісу не дагоніш,
Злосць на каго скіраваць?
Як не забіць, хоць зняважыць
Хоць бы каго, хто б ні быў.
І паляцеў над дарогай
Нейкай ахвяры шукаць.

Хутка абраў мужыка
З бочкай вялізнай на возе.
Сеў на яе і дзяўбець,
Дзядзьку таго раздражняе.
Злапаў сякеру мужык
З мэтай патрапіць у дзятла,
Ды на кавалкі разнёс
Бочку, таму што прамазаў.

З бочкі цячэ на дарогу,
Дзядзька ж глядзіць на каня —
Дзяцел дзяўбе таму лоба.
Дзядзька сякерай махнуў —
Дзяцел у неба ўзвіўся,
Конь развітаўся з жыццём.
Плача мужык ашалелы,
Дзятла ліхога кляне.

Дзяцел жа ў хаце ужо,
Дзе мужыковая жонка
Хлеб расчыняць пачала.
Побач дзіця у калысцы.
Дзяцел дзіця дзеўбануў.
Баба ўхапіла палонік.
Дзяцел адскочыў убок.
Баба дзіцёнка прыбіла.

І, лямантуючы гнеўна:
— Каб жа ты выдах, зладзей! —
Спрытным упэўненым рухам
Дзятла накрыла гаршком.
Покуль прыдумвала кару,
З плачам прыцёгся мужык,
Вымавіў сумны аповед —
Так вось было і от так.

— Я ж улавіла таго,
Хто табе там напаскудзіў.
Праўда, пры гэтым дзіця
Тут выпадкова забіла...
— Ладна, дзіця нажывём,
Дзятла таго пакажы мне.
Гада жывога зжару,
Люта яго ненавіджу.

Птушку здранцвелую выграб
Чэпкай мужыцкай рукой,
Скінуў гаршчок на падлогу,
Зяпу раззявіў як след
І каўтануў таго дзятла,
А праз імгненне адчуў —
Пэўна, што дзяцел у пузе
Дасца у знакі яму.

Ён і вантроб'е дзяўбе,
І, дзе ўхопіць, кусае.
І паратунку няма.
Бабе тлумачыць нябога:
— Ты станавіся з касой
Ззаду. А я нахілюся.
Выгляне дзяцел, а ты
Тут галаву яму зрэжаш.

Дзяцел жа хітры, зараза —
Вытыркнуў носа і знік.
Баба касой секанула.
Моцны нятрапны удар
Мужаў азадак адрэзаў.
Дзядзька шалёна завыў,
Дзяцел жа весела свіснуў,
Ды у свой лес паляцеў.

**Зайкава хатка**
Беларуская народная казка

У лесе хваёвым жылі
Суседзі — лісіца і заяц.
Ды неяк з пачаткам зімы
Адчулі — як ёсць замярзаюць.
Схаваліся ўсе камары,
Ляглі ў бярлогі мядзведзі,
І пабудавалі сабе
Зімовыя хаткі суседзі.

Ліса узвяла са сняжку,
З пяску змайстраваў сабе заяц.
Як толькі мінула зіма,
Лісіная хатка растала.
Лісіца да зайца пайшла,
Прагнала вушастага з дому.
І што, раскажыце, рабіць?
Куды падавацца маломуʼ?

І плача малое зайчо,
А воўк, прабягаючы побач,
Спытаў:
— Што за справы, касы?
Ты хнычаш? Чаму гэта робіш?
Ну, зайка яму распавёў.
І воўк абурыўся, канешне:
—Хадзем, мы прагонім лісу,
Усё будзе добра урэшце.

На ганку спыняецца воўк,
Застрашыць лісіцу спрабуе:
— Як з печы цябе пацягну!!
Як плечы табе адрыхтую!!
Лісіца ж яму у адказ:
— Як толькі хвастом замахнуся,
Адразу хавацца бяжы,
Адразу, дурыла, ратуйся!

Даў дзёру, злякаўшыся, воўк,
Зайчо яшчэ горай заплакаў,
Але падыходзіць мядзведзь,
Таксама не абыякавы.
Ну, зайка сваё распавёў.
Мядзведзь абурыўся, канешне:
— Хадзем, мы прагонім лісу,
І ўсё будзе добра нарэшце.

Да хаты дайшоў і пачуў:
— Як толькі хвастом замахнуся,
Адразу хавацца бяжы,
Адразу, дурыла, ратуйся!
І гэты магутны мядзведзь
Уцёк, не сказаўшы ні слова,
А зайчык у горы сваім
Пачуўся зусім ерундова.

Сядзіць, горка плача зайчо.
Аж певень з’явіўся у лесе.
Спытаў:
        — Ці пакрыўдзіў, мо, хто?
Нагода якая у стрэсу?
І зайка ізноў распавёў.
Раз’юшыўся певень адразу:
— Хадзем, пераможам лісу,
Хадзем пакараем заразу.

— Куды табе, Пеця? Яна
Ваўка і мядзведзя прагнала!
А певень пакрочыў ужо,
Ягоная злосць узрастала:
— Я грозны пятух-чабятух,
Засекчы лісіцу плануе.
Нясу я касу на плячах,
Нішто ўжо лісу не ўратуе!

І чуе такое ў адказ:
— Як толькі хвастом замахнуся,
Адразу хавацца бяжы,
І сам ты, дурыла, ратуйся!
А певень нагу на парог
Паставіў упэўнена гэтак
І кажа:
        — Такія, як я,
Заўсёды даходзяць да мэты.

Я грозны пятух-чабятух,
Засекчы лісіцу плануе.
Нясу я касу на плячах,
Нішто ўжо лісу не ўратуе!
І чуе наноў у адказ:
— Як толькі хвастом замахнуся,

Адразу хавацца бяжы,
І сам ты, дурыла, ратуйся!

На гэтым размовам канец.
Ускочыў пятух на пяколак.
Ды так кукарэкнуў разок,
Што грымнула лісанька долу.
Парвала штаны аб парог
Ды знікла ў кірунку няпэўным.
А ў хатцы дагэтуль жывуць
Шчаслівыя зайка і пеўнік.



Сава Гарай
Партрэт дзеда (2015)